*Да 100-годдзя БДУ*

# Казімір Малевіч і Мядзельшчына

**НЕ так даўно на філалагічным факультэце БДУ адбыўся семінар-дыялог “Казімір Малевіч і беларускі авангард”, на які быў запрошаны Ігар Малевіч — сусветна вядомы вучоны-фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.**









Навуковец доўгі час узначальваў навуковую лабараторыю ў НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ, працаваў у лазернай абсерваторыі НАСА ў Тэхасе, прафесарам Гарвардскага ўніверсітэта, універсітэта Браўна ў Род-Айлендзе (ЗША), дыпламатам у Кітайскай Народнай Рэспубліцы і Рэспубліцы Карэя. Цікавы факт біяграфіі — ён з’яўляецца унучатым пляменнікам знакамітага мастака, якому і прысвяціў кнігу “Казімір Малевіч. Узыходжанне на крыж лёсу” (Мінск, 2012). Дзякуючы вуснаму і пісьмоваму расповеду сучасніка можам пераканацца, што беларуская зямля здольна ўзгадавАць геніяў сусветнага маштабу, а, у прыватнасці, Мядзельшчына, — натхніць на стварэнне сусветна вядомых шэдэўраў — авангардных карцін.

Казімір Малевіч (1879–1935) — мастак, большасці вядомы ў першую чаргу як аўтар знакамітага “Чорнага квадрата”. Гэта работа складае трыпціх (разам з “Чорным кругам” і “Чорным крыжам”). Менавіта даследаванні фізіка-лазершчыка Ігара Малевіча дапамагаюць нам дакладней зразумець сэнс філасофскіх карцін заснавальніка супрэматызму (віду абстракцыянізму — мастацтва без наратыву).

Мы даведваемся пра сапраўдныя факты біяграфіі геніяльнага мастака, бо да гэтага часу ў афіцыйных звестках пра Казіміра Малевіча ўказваецца на яго польскае паходжанне, а месца нараджэння — Кіеў. Што мае тлумачэнне: бацька мастака Севярын Малевіч удзельнічаў у паўстанні і пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага і вымушаны быў з’ехаць ад праследу на Украіну і містыфікаваць некаторыя факты сваёй біяграфіі і біяграфіі сына. Хоць нідзе раней не ўказвалася на беларускія карані Казіміра Малевіча, на той факт, што нарадзіўся ён на Капыльшчыне, але ўсюды ўказвалася, што свае філасофскія трактаты, у тым ліку і “Супрэматызм. Свет як беспрадметнасць ці вечны спакой”, створаны былі на ліцвінскай мове (беларускай лацініцы з выкарыстаннем дыялектных слоў нашай мясцовасці).

Шырока вядомым фактам біяграфіі мастака з’яўляецца тое, што ён у 1919–1922 гадах кіраваў майстэрняй у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы, якое ўзначальваў Марк Шагал. Але не ўсе ведаюць, што да гэтага на родную зямлю яго вярнула Першая сусветная вайна — у 1916-м Казімір Малевіч служыць у Віцебска-Смаленскім інтандацкім палку ў ваеннадарожным атрадзе, які збіраў у мясцовага насельніцтва прадукты для арміі. Яго батальён кватараваў у мястэчку Рыдзюкі каля станцыі Крывічы, дзе праходзіла аднакалейная чыгунка, па якой забяспечвалася армія. Кожны дзень на кароткіх прыпынках каля Крывічоў, Княгініна, Свіры, Мядзела Казімір Малевіч маляваў на рэквізаваных для фронту ільняных тканых палотнах свае “супрэмусы” вайны. Кожны дзень вайны даваў нумар карціне замест назвы. Карціны, скручаныя ў рулоны, адсылаліся цягнікамі як салдацкія пасылкі для сям’і. Так было створана пад 60 палотнаў, у якіх мастак раскрыў “супранатуралізм” вайны, яе трагічную бессэнсоўнасць, трансфармацыю свядомасці. І менавіта тут, на Мядзельшчыне, у Казіміра Малевіча нарадзілася ідэя яго “архітэктонаў” — мадэляў гарадоў будучыні, якія можна пабудаваць, разабраць і сабраць зноў, каб зберагчы ад жахаў ваеннай разрухі; дарэчы, гэта прарочая ідэя ўвасоблена сёння ў манхэтанскіх і пекінскіх хмарачосах.

Сёння нас, магчыма, здзівіць такая колькасць супадзенняў. Але менавіта радзіма, месца нараджэння аўтара, месца стварэння яго шэдэўраў маюць прынцыповае значэнне, таму што само жыццё, творчасць — гэта крыніца інтуітыўнага спазнання. І, напэўна, прымушае нас глыбока задумацца, напрыклад, дзіўная карціна “Чорны квадрат” Казіміра Малевіча, якая каштуе пад 60 мільёнаў долараў ЗША, створаная на нашай роднай зямлі, пад уплывам чорных квадратных тарфяных копанак, якія рабілі зімой у балоце, пакрытым белым снегам, жыхары Капыльшчыны.

Лёс вядомага мастака загадкавы і трагічны, на радзіме няма ніводнай карціны, яны ў лепшых музеях свету ад Кёльна да Нью-Ёрка. На жаль, бясцэнная спадчына была вывезена за мяжу: часткова — у 1920–30 гады і канчаткова — на другім тыдні Вялікай Айчыннай вайны спецыяльным нямецкім авіядэсантам па захаванні культурнай спадчыны.

Упэўнена, што імем Казіміра Малевіча мы павінны ганарыцца, бо менавіта наша родная зямля натхніла і развіла талент мастака-прарока, які ў творчасці рэалізаваў сэнс свайго духоўнага прызначэння, адкрыў нам таямніцы адноснасці змены формы на адлегласці і сваёй інтуіцыяй мастака прадбачыў наступныя адкрыцці навукі. І, канечне ж, жыць з надзеяй, што Мядзельшчына народзіць яшчэ не адно пакаленне геніяў і іх шэдэўраў.

**Ірына ШМАТКОВА,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.

**У кастрычніку 100-гадовы юбілей адзначае вядучая вышэйшая навучальная ўстанова краіны — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. За гэты час яна выкавала незлічоную колькасць кадраў самага вышэйшага гатунку амаль ва ўсіх галінах навукі. Універсітэт традыцыйна ўваходзіць у топ сусветных рэйтынгаў, працягвае здзіўляць адкрыццямі і сёння.**

**МОЙКА, защита, покраска крыш.**
Т.: +37533 340-94-78 (МТС), +37529 340-94-73 (А1).
УНП 691406601. ИП Дубровский В. В.

**РЕСТАВРАЦИЯ ВАНН** жидким окрилом (наливная ванна). Качество. Гарантия.
Т.: +37533 340-94-78 (МТС), +37529 340-94-73 (А1).
УНП 691406601. ИП Дубровский В.В.

**КОТЛЫ отопительные. Установка.**
Большой выбор. Т. 8-029 286-65-32. УНП 391054834. ИП Орехво А. В.

**ПЕНОПЛАСТ. ВСЁ ДЛЯ УТЕПЛЕНИЯ**
Т. 8-029 714-89-16.
УНП 391172792. ЧП «Впрок».

ПРОДАЖА **отрубей, комбикорма, зерна.** Доставка.
Т.: 8-029 399-80-02, МТС 8-029 749-76-46. УНП 691405289. ИП Ярчак И. Р.

**УСЛУГИ**
-ПОГРУЗЧИКА (АМКОДОР);
-ЭКСКАВАТОРА-ПОГРУЗЧИКА;
-АВТОКРАНА;
-МАЗа (10-20 тонн).
Т. 8-029 177-91-02.
УНП 691408196. ИП Поплевко Д. Л.

**Автостекла** (г. Поставы)
Продажа. Установка. Ремонт.
Т. +37529 516-45-67.
УНП 390478401. ИП Островский В. А.

**Монтаж заборов под ключ**
Т.: 8-029 704-20-06, 8-044 711-99-29.
УНП 692023004. ИП Судникович А. В.

**УСЛУГИ ПЕЧНИКА**
*Печь, плита, камин, лежак, русская печь.* Тел. 8-029 292-16-48.
УНП 391172432. ИП Холдей В. Э.

**КРОВЛЯ, ФАСАД, САНТЕХНИКА** – материалы, работа. По кредитам — ЛЬГОТНЫМ для МНОГОДЕТНЫХ семей. КАРКАСНЫЙ ДОМ — под ключ. Т.: +37529 686-44-60, +37533 630-14-40, эл. адрес: zahariatrade@mail.ry.
УНП 692019901. ИП Жуковский О. В.

**КУПИМ ВАШ МЕТАЛЛОЛОМ**
ОАО "Белвторресурсы" закупает лом чёрных и цветных металлов, вторичные материалы, в том числе стеклобой и макулатуру.
**Наш адрес:** г. Мядель, ул. Интернациональная, 4/4 (проходная бывшего ПМК-215). Возможен вывоз по согласованию.
Телефон +37529 963-29-86 (А1).
УНП 100024578.

**КОЛОДЦЫ. Чистка, копка, ремонт и углубление.**
Т.: 8-033 336-26-17, 8-025 934-49-29.
УНП 591810348. ЧТУП "НАГ-Групп".

***СПУТНИКОВЫЕ АНТЕННЫ***
*Установка, ремонт и др.*
Т.: 8-029 214-71-45, 8-029 913-82-55.
УНП 391624262. ИП Черенко Д. П.

**ПЕЧНИК**
Т. 8-029 142-88-56.
УНП 693210504. ИП Баслык В. В.

**ВСЁ ДЛЯ ЗАБОРОВ и КРОВЛИ**
СЕТКА-РАБИЦА, профнастил, евроштакетник, ворота, столбы, арматура. ДОСТАВКА. УСТАНОВКА. Т. 8-029 704-03-46.
УНП 692028195. ИП Сташкевич А. М.

**ПЛИТКА** – работа любой сложности. Объёмы. Т.: +37529 686-44-60, +37533 630-14-40, эл. адрес: zahariatrade@mail.ry.
УНП 692019901. ИП Жуковский О. В.

**Бурение скважин** на воду. Подвод воды в дом.
Рассрочка платежа.
Т.: 8-029 555-58-16, 8-025 706-66-93.
УНП 691414986. ИП Русак В. В.

**БУРЕНИЕ** скважин на воду под ключ. Быстро, качественно, недорого. Т. 8-029 128-78-78.
УНП 590945450. ИП Янцевич А. Г.

**МОНТАЖ** бетонных колец, септиков и водостоков под ключ. **АРЕНДА** мини-экскаватора, мини-погрузчика, манипулятора, самосвала. Т. 8-029 581-33-74.
УНП 192603504. ИП Родевич П. П.

**Бурение скважин**
НИЗКИЕ ЦЕНЫ! Рассрочка!
Подвод воды в дом.
Наличный и безналичный расчет.
**Услуги манипулятора, кольца ЖБИ.**
Т.: 8-029 944-72-24, 8-033 691-17-59.
УНП 691410712. ИП Матин А. Н.

***Kиосk "Автозапчасти"***
*в г. п. Свирь* ***ПРИГЛАШАЕТ*** *за* ***покупками****, в наличии и под заказ, кредит, отсрочка платежа, рассрочка.* ***Ждем по адресу:*** *г. п. Свирь, Торговая площадь, киоск.*
Т. 8-044 556-21-78.
УНП 691407822. ИП Мороз И. З.

**ПРИНИМАЕМ МЕТАЛЛОЛОМ!** Княгининский участок ОАО «Белвторчермет» принимает от населения бытовой лом черных металлов **по цене 61 коп. за кг.**
***Расчеты за металлолом производятся в день сдачи!***
**Адрес участка:** Мядельский р-н, аг. Княгинин.
**Телефоны: 8-01797 34-8-90, 8-029 974-07-39.**
УНП 100071565.